Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктарБДУКМ
___________________А. А. Корбут
«____» ______________2016 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РЭЖЫСУРА СВЯТ

*Праграма дзяржаўнага экзамену*
*па спецыяльнасці 1-17 01 05Рэжысура свят (па напрамках),напрамку спецыяльнасці1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя)*

2016

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*А. Д. Вавілаў,* дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
*П. А. Гуд,* прафесар кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, прафесар;
*А. А. Гулак*, дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук;
*А. Я. Камінскі*, загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», дацэнт кафедры;
*А. Г. Фядотаў,* дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**:
*Т. М. Бабіч*, дацэнт кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культурыБДУКМ, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;
*В. М. Ярмалінская*, загадчык аддзела тэатральнага мастацтва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 27.02.2015 г.);
*саветам* факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 23.03.2015 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 21.12.2015 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. Я. Камінскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дзяржаўны экзамен па спецыяльнасці«Рэжысура свят» прадугледжвае кантроль тэарэтычных ведаў студэнта на міждысцыплінарным узроўні, які ахоплівае наступныя дысцыпліны: «Рэжысура свят», «Традыцыйная святочная культура беларусаў», «Тэхналогія стварэння свята». Змест праграмы распрацаваны на аснове дзяржаўнага адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці, у адпаведнасці з дзеючымі вучэбнымі праграмамі па вучэбных дысцыплінах.

Пры падрыхтоўцы да выніковай атэстацыі развіваюцца і фарміруюцца наступныя акадэмічныя і прафесійныя кампетэнцыі спецыяліста:

– уменне працаваць самастойна;

– быць здольным параджаць новыя ідэі;

– валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі;

– ажыццяўляць работу пастановачных груп па арганізацыі і правядзенні розных форм святочнай культуры;

– аналізаваць гістарычныя аспекты, перспектывы, напрамкі захавання і развіцця народнай творчасці, святочнай культуры;

– кантраляваць работу творчага, кіраўнічага, тэхнічнага падраздзяленняў арганізацыйнага камітэта па розных пытаннях арганізацыі і правядзення свята;

– арганізоўваць работу творчых калектываў падчас правядзення свят для дасягнення пастаўленых мэт і задач;

– праводзіць культурна-асветніцкія мерапрыемствы для выхавання мастацка-эстэтычнага густу ўсіх катэгорый насельніцтва ва ўстановах культуры, спорту і адукацыі і іншых установах;

– наладжваць творчыя семінары, круглыя сталы для дзеячаў культуры і мастацтва падчас падрыхтоўкі свята;

– выступаць у сродках масавай інфармацыі з мэтай данясення звестак аб правядзенні свята;

–ладзіць арганізацыю і правядзенне маштабных фестываляў на адкрытай прасторы, прысвечаных актуальным пытанням сучаснага грамадства.

Дзяржаўны экзамен па спецыяльнасці«Рэжысура свят» праводзіцца ў форме вуснага адказу студэнта на пытанні экзаменацыйных білетаў па творчым і арганізацыйным забеспячэнні святочных дзей рознай тэматычнай і жанравай накіраванасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Экзаменацыйны білет уключае 3 пытанні па раздзелах дадзенай праграмы, якія адпавядаюць вучэбным дысцыплінам, вынесеным на дзяржаўны экзамен. Студэнт можа адказваць на пытанні білетаў, грунтуючыся на аснове распрацаванага ім асабіста рэжысёрскага праекта дыпломнага свята.

На падрыхтоўку да адказу на дзяржаўным экзамене кожнаму студэнту адводзіцца не менш за 30 хвілін, на здачу дзяржаўнага экзамену адводзіцца да 30 хвілін.Для ўдакладнення экзаменацыйнай адзнакі студэнту членамі ДЭК могуць задавацца адпавядаючыя праграме дадатковыя пытанні. Вынікі здачы дзяржаўнага экзаменуапавяшчаюцца ў той жа дзень пасля афармлення адпаведных пратаколаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ЭКЗАМЕНУ

## Раздзел I. Рэжысура свят

### *1. Тэатралізацыя як творчы метад сінтэзу мастацкіх сродкаў і жыццёвай рэчаіснасці. Суадносіны паняццяў «ілюстрацыя» і «тэатралізацыя»*

Тэатралізацыя як метад мастацкага адлюстравання рэчаіснасці. Сцэнарная тэатралізацыя. Рэжысёрская тэатралізацыя. Віды тэатралізацыі – простая альбо кампіляцыйная, складаная альбо арыгінальная і змешаная. Ілюстраванне – як пацвярджэнне, падмацаванне, аргументаванне мастацкім матэрыялам факта альбо інфармацыі. Тэатралізацыя – вобразнае рашэнне злучэння сацыяльназначнай інфармацыі і сродкаў мастацтва.

### *2. Рэжысёрская задума свята і яе кампаненты*

Рэжысёрская задума свята як сістэма вызначэння асноўных пачатковых кампанентаў стварэння святочнага дзеяння. Змест і накіраванасць кампанентаў рэжысёрскай задумы свята.

Распрацоўка «Палажэння аб правядзенні свята» з дэталізацыяй яго асноўных аспектаў: мэта і задачы свята, умовы яго правядзення, склад аргкамітэта, комплекс заданняў для арганізацый, устаноў і прадпрыемстваў, крытэрыі ацэнак конкурсных выступленняў удзельнікаў, склад журы.

Вызначэнне тыпалагічнай групы насельніцтва, якой прысвячаецца свята. Аналіз архітэктурна-ландшафтных асаблівасцей месца правядзення. Вырашэнне формы ўвасаблення свята (рэстаўрацыя, рэканструкцыя, трансфармацыя, новае святочнае формаўтварэнне). Папярэдні варыянт прапануемай праграмы свята.

### *3. Рэжысёрскае вырашэнне свята як адзіны прынцып увасаблення рэжысёрскай задумы мастацкімі сродкамі*

Этапы нараджэння рэжысёрскага вырашэння відовішча. Вывучэнне часу, рэчаіснасці, характараў, адлюстраваных у відовішчы. Выпрацоўкасуб’ектыўныхадносін і рэжысёрскайзахопленасцітэмайбудучайпастаноўкі. Пошукіметафарычныханалагаўпадзейбудучагавідовішча. Знаходжаннезерня (ключа) для ўвасаблення і вобразнагавырашэннярэжысёрскайзадумы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*4. Гульня ў структуры сучаснага свята*

Разгляд тэрміна «гульня». Месца гульні ў народным свяце. Гульня і развіццё пазнавальнай, творчай дзейнасці чалавека. Псіхолага-педагагічныя асновы гульнявых зносін. Гульня як частка духоўнай культуры народа, як від арганізацыі вольнага часу чалавека. Адлюстраванне культурных традыцый у змесце гульні. Гульня як форма стварэння перадсвяточнай і святочнай атмасферы, сродак актывізацыі ўдзельнікаў свята.

*5. Пастаноўка гульнявой праграмы.*
*Актывізацыя ўдзельнікаў свята праз гульнявыя дзеянні*

Вызначэнне сцэнарна-рэжысёрскага ходу праграмы; разнастайнасць гульнявога жанру; кампазіцыйнай пабудовы; чаргаванне гульнявых жанраў; насычанасць рэплікамі, прымаўкамі, прыказкамі; увядзенне персаніфікацыі. Падбор і чаргаванне гульнявых момантаў у залежнасці ад выяўлення інтэлектуальных і фізічных здольнасцей аўдыторыі. Сімвалічны сэнс прызоў і прадметаў у праграме.

*6. Прафесійныя якасці вядучага гульні,*
*яго роля як стваральніка гульнявой сітуацыі*

Агульная эрудыцыя, густ, такт, пачуццё гумару вядучага праграмы. Камунікабельнасць, мастацтва імправізацыі, навыкі акцёрскага майстэрства –галоўныя патрабаванні да вядучага гульні.

Патрабаванні да тлумачэння ўмоў гульні. Выкарыстанне ў якасці дэманстратараў гульні персанажаў фальклору, скамарохаў, клоўнаў і г. д. Спосабы падзелу каманд для гульні. Упраўленне ходам гульні. Стварэнне ўмоў для выяўлення самадзейнасці ўдзельнікаў. Сцэнічны касцюм вядучага і яго роля ў правядзенні праграмы.

*7. Стварэнне нумара на аснове разнажанравага*
*літаратурнага матэрыялу,*
*твора вусна-паэтычнай творчасці*

Шляхі пераўтварэннялітаратурнага, вусна-паэтычнага матэрыялу ў сцэнічны твор. Тры ўзроўні станаўлення сцэнічнага твора – літаратурны, рэжысёрскі, акцёрскі. Этапы рэжысёрскай распрацоўкі. Музычнае вырашэнне нумара. Сцэнаграфічнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вырашэнне нумара. Пластычнае вырашэнне нумара. Арганізацыя рэпетыцыйнага працэсу. Асаблівасці рэжысуры нумара на эстрадзе і ў тэатралізаваным прадстаўленні.

*8. Рэжысёрская распрацоўка нумара на аснове музычна-песеннага матэрыялу*

Музычна-песенная форма твора як першааснова вакальнага нумара. Драматургія нумара. Сцэнічная культура выканаўцы. Дапаможныя выразныя сродкі (касцюм, грым, пластыка, танец, відэа). Лёгкасць, адкрытасць, шчырасць пачуццяў, лаканізм, святочнасць вакальнага нумара.

*9. Мантаж як мастацкі метад. Тэхналагічныя прыёмы мантажу ў свяце і тэатралізаваным прадстаўленні*

Мантаж – асноўны спосаб арганізацыі тэатралізаванага прадстаўлення, канцэртнай дзеі. Часовыя і прасторавыя віды мантажу. Асноўныя сэнсавыя пары (выканаўца – мастацкі вобраз нумара; фон – мастацкі вобраз нумара). Паслядоўны, паралельны, асацыятыўны мантаж.

*10. Сцэнарна-рэжысёрскі ход, яго роля і функцыі ў кампазіцыйнай пабудове прадстаўлення, свята*

Сцэнарна-рэжысёрскі ходяк прыём, які аб’ядноўвае разрозненыя часткі сцэнарыя ў адзінае драматургічнае цэлае. Раскрыццё прыкладаў вызначэння рэжысёрам унутранай праявы сцэнарна-рэжысёрскага ходу. Прыклады выяўлення знешняй праявы дзеі праз носьбітаў сцэнарна-рэжысёрскага ходу.

*11. Сутнасць паняццяў «тэатралізаванае прадстаўленне», «свята», «відовішча», «шоу-праграма»*

Тэатралізаванае прадстаўленне – творчае асэнсаванне рэчаіснасці, фактаў, музычнай, харэаграфічнай і іншай дакументальнай альбо мастацкай інфармацыі, ператварэнне іх у тэатр, наданне феномена, не маючаму адносін да тэатра, гульнявых і ролевых рыс. Відовішча – сцэнічнае дзеянне, якое прываблівае свядомасць перш-наперш пры дапамозе візуальнасці. Шоу-праграма – забаўляльнае мерапрыемства пастановачнага характару.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12. Тэатралізаванае прадстаўленне як самастойная кампазіцыйная пабудова і структурная адзінка свята*

Тыпалогія прадстаўленняў як самастойных відовішчных форм. Прадстаўленне як цэнтральная частка свята, яго адметныя рысы і выразныя сродкі. Асноўныя этапы работы над стварэннем тэатралізаванага прадстаўлення ў свяце. Пошук сцэнарна-рэжысёрскага ходу прадстаўлення. Выразныя сродкі тэатралізаванага прадстаўлення.

*13. Тэатралізаванае прадстаўленне на аснове падрыхтаваных нумароў*

Тэатралізаванае прадстаўленне – сцэнічнае эстрадна-тэатральнае дзеянне, аб'яднанае адзінай думкай, у якім мантажна спалучаюцца ўсе віды, жанры літаратуры і мастацтва. Публіцыстычныя, святочныя, дзіцячыя, эстрадныя прадстаўленні, прадстаўленні-капуснікі, прадстаўленні-кірмашы, прадстаўленні-канцэрты, агітпрадстаўленні.

*14. Пастаноўка прадстаўлення на аснове дакументальнага матэрыялу*

Віды дакументальнага матэрыялу. Спасціжэнне сутнасці падзей, выкладзеных у дакументальных крыніцах. Мастацкае асэнсаванне дакументальнага матэрыялу. Тэатралізацыя як арганізацыя дакументальнага матэрыялу па законах драматургіі. Прыём пастаноўкі «пад дакумент». Межы рэжысёрскай свабоды пры рабоце з дакументальным матэрыялам.

*15. Рэжысура тэатралізаванага шэсця ў свяце*

Вызначэнне паняцця «тэатралізаванае шэсце». Класіфікацыя і характарыстыка відаў шэсця. Вызначэнне рэжысёрам ідэйна-тэматычнай, функцыянальнай, жанравай накіраванасці і вобразна-асацыятыўнага рада ўвасабляемага шэсця. Распрацоўка зместу і выразных сродкаў асноўных структурных частак шэсця. Мастацка-дэкаратыўнае афармленне эпізодаў шэсця. Распрацоўка музычнага суправаджэння шэсця. Вызначэнне хуткасці ходу шэсця і адлегласцей паміж эпізодамі ў розных месцах увасаблення. Размеркаванне ўвасаблення эпізодаў шэсця паміж арганізацыямі, прадпрыемствамі, установамі. Рэпетыцыйная работа рэжысёра з асістэнцкай групай і выканаўцамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*16. Мізансцэна – мова рэжысёра. Віды мізансцэн*

Паняцце «мізансцэна». Прызначэнне мізансцэны як спосабу адлюстравання ўнутраных узаемаадносін дзеючых асоб праз знешнія спалучэнні фігур. Мізансцэна як асноўны выразны сродак выражэння тэмы, ідэі, падзеі, канфлікту, тэмпарытму, вобразнага вырашэння дзеяння.Першыя распрацоўшчыкі мізансцэн(антычныя драматургі, аўтары Сярэдневякоўя, Новага часу і інш.), іх роля ў стварэнні пластычнага малюнка дзеі. Асноўныя (слова і дзеянне) і дадатковыя (музыка, шумы, гук, святло, касцюм) кампаненты мізансцэны і іх характарыстыка. Авансцэна як спосаб набліжэння мізансцэны да гледача. Віды мізансцэн ііх выразныя магчымасці. Адналінейныя, двухлінейныя і кругавыя мізансцэны як асноўныя пластычныя формы ў народным свяце. Новыя віды мізансцэн з выкарыстаннем рухальных платформ на аснове аўтамабіляў, вежавых кранаў, верталётаў і г. д. Спосабы запісу мізансцэн, іх характарыстыка.

*17. Асаблівасці работы рэжысёра з рознымі катэгорыямі ўдзельнікаў свята: аматарамі, прафесіяналамі, а таксама спецыфічнымі групамі выканаўцаў*

Трыадзінства асобы рэжысёра па вызначэнні У. І. Неміровіча-Данчанкі. Арганізацыйныя і педагагічныя функцыі пастаноўшчыка падчас работы з аматарскімі калектывамі і выканаўцамі. Работа з прафесійнымі артыстамі і калектывамі. Пастановачная работа са спецыфічнымі групамі выканаўцаў:вайскоўцамі, спартсменамі, падлеткавымі, дзіцячымі калектывамі, з дзецьмі, якія маюць адхіленні ў псіхафізічным развіцці.

*18. Пастаноўка масавых сцэн у прадстаўленні, свяце. Творчы і тэхналагічны аспекты пастановачнай работы*

Масавая сцэна як яскравы выразны сродак свята і адлюстраванне найбольш значных ідэй і пачуццяў мастацкага відовішча. Рэжысёрская задума масавых сцэн свята, прадстаўлення. Самастойная работа рэжысёра па падрыхтоўцы буйнамаштабных сцэн. Інструктаж членаў пастановачнай групы свята і работа з арганізацыямі, зацікаўленымі ў правядзенні свята. «Штабныя гульні» з членамі пастановачнай групы перад правядзеннем рэпетыцый. Асаблівасці правядзення рэпетыцый масавых сцэн свята, прадстаўлення. Тэхналогія пастаноўкі буйнамаштабных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

масавых фіналаў у канцэртах і тэатралізаваных прадстаўленнях.

### *19. Мастацкі вобраз свята і яго адлюстраванне ў музычным, пластычным і архітэктурна-дэкаратыўным вырашэннях свята*

Мастацкі вобраз – форма метафарычнага мыслення ў мастацтве, якая раскрывае адну з'яву праз другую. Шматзначнасць, багацце, глыбіня мастацкага вобраза і яго індывідуалізаваны характар («агульнае праяўляецца ў індывідуальным і праз індывідуальнае», Ю. Бораў). Недагаворанасць мастацкага вобраза відовішча (прынцып nonfinito) – шлях да абуджэння творчай фантазіі гледача. Грунтоўнае спасціжэнне тэмы і асацыятыўнае мысленне рэжысёра – шлях да знаходжання і фіксацыі мастацкага вобраза пастаноўкі. Вербальнае вызначэнне мастацкага вобраза пастаноўшчыкам. Пошукі ўвасаблення мастацкага вобраза ў архітэктурна-дэкаратыўным, музычным і пластычным вырашэннях свята. Гарманічнае спалучэнне элементаў рэжысёрскага вырашэння – шлях да ўвасаблення мастацкага вобраза відовішча.

### *20. Асаблівасці рэжысуры свят сучаснага горада і вёскі*

Асаблівасці рэжысуры свята ў горадзе поліфанічнай накіраванасці: стварэнне свята на дакументальнай аснове, размеркаванне святочных пляцовак у традыцыйных месцах святкавання. Вызначэнне галоўнай і другарадных сцэнічных пляцовак свята. Пераважная кампазіцыйная пабудова свята з яго пачаткам, кульмінацыяй і завяршэннем ў адным месцы (на галоўнай пляцоўцы) і развіццём святочнай дзеі на другарадных сцэнічных пляцоўках. Стварэнне відовішчных і масава-гульнявых зон дзеяння свята. Арганізацыя самаакупных святочных дзей (прадстаўленні, канцэрты, гульнявыя латарэі і інш.).

Асаблівасці рэжысуры свята вёскі: стварэнне традыцыйнага месца святкавання; распрацоўка паэтапнага ўвасаблення свята ў адным месцы; увасабленне свята ў масава-гульнявой форме. Выкарыстанне ў свяце мясцовага фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу, творчых калектываў, твораў сучасных мясцовых аўтараў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*21. Эстрадна-цыркавыя і арыгінальныя нумары ў структуры сучаснага свята*

Тыпы эстрадна-цыркавых нумароў: эквілібрыстыка, жангліраванне, прэстыдыжытацыя, акрабатыка, клаўнада, пантаміма, бурымэ, імітацыя, пародыя, буфанада. Арыгінальныя нумары як злучэнне паміж блокамі прадстаўлення, свята.

*22. Канцэрт – як форма эстраднага прадстаўлення. Віды і жанры канцэртаў*

Зборны, дзіцячы, сольны і справаздачны канцэрты. Монаспектакль. Камерны канцэрт. Тэматычны, эстрадны, сімфанічны, гала-канцэрт і шоу. Канцэрт на стадыёне. Тэатралізаваны канцэрт. Відавая і жанравая разнастайнасць. Тэматычнае спалучэнне. Дакладнасць пераходу ад аднаго нумара да наступнага. Асаблівае значэнне пачатковых і фінальных нумароў. Улік тэхнічнага абсталявання выступленняў (інструменты, станкі і падстаўкі, цыркавое і спартыўнае абсталяванне). Асноўныя (гендарныя, тэмпарытмічныя) заканамернасці складання канцэртных праграм.

*23. Этапы пастаноўкі канцэртнай праграмы*

Прагляд і адбор нумароў. Ініцыяцыя іх стварэння ў выпадку мастацкай неабходнасці. Рэжысура нумара і работа з кіраўнікамі мастацкіх калектываў. Аб’яднанне нумароў у мастацкасэнсавыя блокі. Блокавая арганізацыя канцэртнага відовішча. Бесперапыннасць канцэртнай дзеі (суперзаслона, светлавая заслона, дадатковыя пляцоўкі, выкарыстанне валанцёраў-машыністаў сцэны). Уваход на сцэну і выхад з яе масавых калектываў. Асаблівасці рэпетыцыйнай працы. Завочны рэжысёрскі рэпетыцыйны працэс. Інтэрактыўная рэжысура нумароў. З’ява «самарэжысуры» і «хатняй рэжысуры» ў канцэртнай творчасці.

*24. Выразныя сродкі рэжысуры канцэрта*

Відэасюжэты і відэаінсталяцыя (работа з экранамі і манітрамі). Харэаграфічныя, цыркавыя і пластычныя фонавыя групы. Асвятляльныя і лазерныя эфекты. 3D-мапінг. Музычныя паўзы. Сцэнаграфічнае рашэнне канцэрта. Работа рэжысёра з мастаком. Сюжэтны ход, ролевая персаніфікацыя, сцэнагра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фія, відэасюжэты, касцюміраванне – асноўныя спосабы тэатралізацыі. Мастацка-сэнсавыя блокі. Тэатралізаваныя пралог і фінал. Саўндтрэк. Манціровачныя рэпетыцыі. Зводныя,прагонныя рэпетыцыі. Вядучы (вядучыя) канцэрта і яго функцыі. Канферанс і канферансье. Разнастайнасць канферанса. Голас «па-за кадрам». «Non-стоп».

*25. Прасторавае вырашэнне свята ў гарадах монацэнтрычнага, поліцэнтрычнага тыпаў і ў іншых відах архітэктурна-ландшафтнага асяроддзя*

Прасторавае вырашэнне свята як арганізацыя сукупнасці тэхнічных і мастацкіх сродкаў пастаноўкі, навакольнага асяроддзя суадносна з рэжысёрскай задумай відовішча. Характарыстыка сучасных гарадоў монацэнтрычнага і поліцэнтрычнага тыпаў. Функцыянальнае адрозненне пабудовы святочнай кампазіцыі ў гарадах монацэнтрычнага і поліцэнтрычнага тыпаў. Мастацкая арганізацыя элементаў святочнай кампазіцыі на спартыўных аб'ектах, вольнай прасторы (поле, узбярэжжа рэк, living, рознаўзроўневы рэль'еф мясцовасці).

*26. Асаблівасці рэжысуры тэатралізаваных відовішчаў на тэрыторыі мемарыяльных комплексаў і гістарычных помнікаў*

Беларусь – краіна замкаў. Гістарычнае архітэктурнае асяроддзе відовішча як паўнавартасны кампанент святочнай кампазіцыі. Дзяржаўная праграма «Замкі Беларусі» і дзейнасць устаноў культуры па захаванні нацыянальных гістарычных каштоўнасцей. Спалучэнне старажытнага асяроддзя і сучасных мультымедыйных тэхналогій як сродак змянення мастацкай парадыгмы відовішча. Спецыфіка пастановачнай работы ў асяроддзі гістарычных помнікаў і мемарыяльных комплексаў.

*27. Арганізацыя рэпетыцыйнага працэсу святочных дзей. Віды рэпетыцый і іх функцыянальная накіраванасць*

Рэпетыцыя як творчы сумесны працэс рэжысёра з выканаўцамі розных відаў работ па падрыхтоўцы, папярэдняй распрацоўцы і ўвасабленні розных святочных дзей. Віды рэпетыцый і іх характарыстыка. Парадак правядзення і змест рэпетыцый.

*28. Работа рэжысёра з музычным кіраўніком, гукарэжысёрам над стварэннем музычна-шумавога афармлення свята*

Вобразная і фонавая музыка як дадзенасць сучаснага асяроддзя. Праца з кампазітарам і кіраўніком музычнага калектыву (гурта, групы, ансамбля, аркестра). Музыка ў розных святочных жанрах. Цэласнае гукавое рашэнне свята, яго жыццесцвярджальнай звышзадачы. Сутворчасць рэжысёра і музычнага кіраўніка. Агучванне сцэны (мікрафоны шнуравыя, радыёмікрафоны, мікрафоны на стойках, мабільныя гарнітуры, падвесныя мікрафоны).

*29. Новыя формы і сучасныя тэхналогіі ў рэжысуры тэатралізаваных прадстаўленняў і свят*

Перформанс.Хэпенінг. Флэшмоб. Смартмоб. Відэакантэнт. Відэадызайн. Відэамэпінг (3D-мэпінг). Індормэпінг. Тэхналогія трэкінга. Камп’ютарная графіка. Піратэхніка. Лазерныя эфекты.

*30. Кампазіцыйная пабудова сцэнічнага твора як сродак адлюстравання канфлікту*

Кампазіцыйная пабудова як спосаб раскрыцця зараджэння, развіцця і вырашэння канфлікту. Асноўныя этапы аналізу канфлікту сцэнічнага твора. Кампаненты кампазіцыйнай пабудовы канфлікту знешняй формы, дзе ёсць сутыкненне двух процідзеючых інтарэсаў, поглядаў. Асаблівасці кампазіцыйнай пабудовы асобных сцэнічных твораў (пачатак дзеі адразу з завязкі; раскрыццё сюжэта, пачынаючы з развязкі канфлікту да яго вытокаў, што можа стварыць новы сюжэт). «Адкрыты» і «закрыты» фінал твора.

## Раздзел II. Традыцыйная святочная культура беларусаў

*31.Свята як універсальны феномен народнай традыцыі*

Свята – сакральны час проціпастаўлены штодзённасці. Этычныя нормы паводзін у свяце. Усеагульнасць свята: прысутныя – удзельнікі. Маральна-этычныя нормы святочнай культуры: запрашэнне, прывітанне, гасціннасць, дзякаванне, развітанне, праводзіны, павага да чужога жытла. Шанаванне талакі. Павага да бацькоў, свайго роду (запытанне дазволу, благаслаўленне і інш.), значэнне думкі сялянскага соцыуму. Узроставая і гендарная іерархія: калядаванне, шчадраванне, валачобніцтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*32. Кампаненты народнага свята*

Кампаненты народнага свята: удзел у царкоўным рытуале, хаджэнне на могілкі, да святых месцаў, крыніц, ракі, упрыгожанне культурнай прасторы абрадавымі атрыбутамі, выкананне абрадавых твораў, святочная трапеза, калектыўныя формы баўлення часу (катанне на конях, з гор, гушканне на арэлях, хаджэнне на луг, гульні, карагоды) і інш.

*33. Прыродныя і жыццёвыя цыклы ў народных уяўленнях*

Прыродны час як сукупнасць цыклаў: сонечных (год, суткі), месяцовых (фазы месяца) і вегетатыўных (час росту і выспявання раслін). Этымалогія асобных назваў месяцаў у беларускай традыцыі (*сакавік, жнівень, верасень, кастрычнік* і інш.). Устойлівыя характарыстыкі дзён тыдня. Жыццёвы час (век чалавека). Міфалагема чалавечай долі/лёсу. Народныя ўяўленні пра нязжыты век/самагубства.

*34. Народны каляндар як комплекс традыцыйных вераванняў і абрадавых практык*

Адлюстраванне ў народным календары міфапаэтычных уяўленняў, гаспадарчага і прыродазнаўчага вопыту народа. Каляндарныя абрады як сакральна-магічны комплекс, у склад якога ўваходзяць славесныя, песенныя, гульнявыя, драматычныя і харэаграфічныя жанры. Прыказкі і прыкметы народнага календара.

*35. Рухомыя і нерухомыя святы. Прысвяткі*

Асноўныя звесткі з гісторыі календара. Юліянскі і грыгарыянскі стыль летазлічэння. Рухомыя (пасхацэнтрычныя) святы (адлік па тыднях):*Масленіца, Вербная, Вялікдзень, Радаўніца, Ушэсце, Тройца* і інш. Нерухомыя святы: *Каляды, Стрэчанне, Благавешчанне, Юр'е, Купалле, Пятра і Паўла, Ілья, Спасы, Багач, Узвіжанне, Пакровы, Дзяды* і інш. *Назвы, даты і характар адзначэння ў традыцыях праваслаўных і каталікоў.* Прысвяткі: *Увядзенне, Варвары, Саракі, Аўдакей, Мікола Веснавы, Іван-Галавасек, Варвары, Мікола Зімовы* і інш. Метэаралагічныя і гаспадарчыя прыкметы да прысвяткаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *36. Адлюстраванне архаічных вераванняў і культаў у святочнай культуры: анімізм, фетышызм, татэмізм*

Анімізм – адушаўленне аб’ектаў навакольнага свету. Анімістычная аснова гукання вясны, прывітання нівы, абрадаў Куст, Пахаванне стралы, Дажынкі, абрадаў пераносу свячы ў Цэнтральнай Беларусі і на Падняпроўі і інш. Народная дэманалогія. Фетышызм – вераў звышнатуральныя якасці прадметаў прыроднага (камяні-валуны, «пяруновыя стрэлы», жытні сноп, яйка, вярба, траецкі «май», мак і інш.) ці культурнага паходжання (крыж, грошы, ручнікі, элементы адзення, ежы, вырабы з жалеза і інш.). Татэмізм – сістэма рытуалаў і табу, звязаная з верай у роднасць, паходжанне групы людзей (роду, сям’і, клана) ад пэўнага віду жывых істот ці раслін. Вобразы татэмістычнага паходжання ў святочна-абрадавай культуры: мядзведзь, воўк, каза, бусел, вуж.

### *37. Адлюстраванне архаічных вераванняў і культаў у святочнай культуры: культы*

Культ продкаў як комплекс міфалагічных уяўленняў пра пасмяротнае існаванне душ памерлых (дзядоў), ушанаванне іх на працягу гадавога цыкла. Семантыка культу продкаў у кантэксце сямейных, асобных каляндарных абрадаў. Сакральнае стаўленне да зямлі – адной са стыхій светаўтварэння (разам з вадой, паветрам і агнём). Праявы культу агню ў народнай культуры: купальскі, перуноў, агонь свечкі (грамнічная, чацвярговая, велікодная, вянчальная), хатні агонь (абрад «Жаніцьба коміна»). Праявы культу вады ў народнай культуры: ушанаванне крыніц, вада ў магічных, лекавых практыках, раса, абрад Вадохрышча. Увасабленне культу зеляніны ў велікоднай, юраўскай, траецка-купальскай, вясельнай абраднасці.

### *38. Народнае хрысціянства як феномен традыцыйнай культуры*

Народнае хрысціянства як комплекс вераванняў, які спалучае ў сабе элементы хрысціянскай кананічнай, апакрыфічнай і фальклорнай традыцый. Народна-хрысціянскія паняцці і ўяўленні цесна звязаны з гаспадарчай дзейнасцю чалавека (земляробствам і жывёлагадоўляй) і выражаюцца ў народным кален-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дары, народнай дэманалогіі, медыцыне, метэаралогіі і інш. Трансфармацыі вобразаў хрысціянскіх святых у народнай культуры: *Мікалай Цудатворца, Ілья-прарок, Георгій Пераможац, Улас, Касьян, Параскева-Пятніца, Пётр і Павел*. Інтэрпрэтацыя хрысціянскіх рытуалаў: народнае святкаванне *Раства, Пасхі*. Народная этымалогія назваў свят: *Стрэчанне, Благавешчанне, Саракі, Юр'я, Ілья, Спас, Узвіжанне, Пакровы* і інш. Традыцыі фэстаў (храмавых свят).

### *39. Гендарны аспект традыцыйнай культуры*

Універсальная бінарная апазіцыя традыцыйнай культуры – мужчынскі/жаночы. Сакральная сувязь жаночага пачатку са сферай плоднасці, урадлівасці, маці-зямлі. Вызначальная роля жанчын у каляндарных абрадах. «Жаночыя» абрады і магічныя практыкі (Адведкі, Гуканне вясны, Провады русалкі, Пахаванне стралы, жніўная абраднасць, абворванне, выраб абыдзённіка, замовы). Прадзенне і ткацтва. Сакральная сувязь мужчыны з апладняльным, стваральным пачаткам. «Мужчынскія» абрадавыя дзеянні, скіраваныя на сувязь са светам продкаў (кліканне мароза на куццю, дзядоў на вячэру, валачобніцтва). Земляробства, кавальства, ганчарства, іграннe на музычных інструментах. Гендарныя стэрэатыпы народнай культуры адносна нараджэння сына і дачкі. Прыкметы, звязаныя з палавой дыферэнцыяцыяй.

### *40. Фальклорныя жанры ў кантэксце святочнай культуры: песні каляндарных абрадаў*

Песні каляндарных абрадаў па функцыянальнай прыкмеце. Зімовыя: піліпаўскія, калядныя і шчадроўскія, цярэшкі, масленічныя (запусныя). Вясновыя: песні-вяснянкі, валачобныя, юр'еўскія, траецкія (сёмушныя), куставыя, русальныя, песні веснавой талакі, песні да веснавых карагодаў і гульняў. Летнія: касецкія, купальскія, пятроўскія, песні да летніх карагодаў, жніўныя. Восеньскія: ярынныя, ільняныя, талочныя. Міфасемантыка песень каляндарных абрадаў. Паэтызацыя прыроды, працы і дабрабыту земляроба. Увасабленне гаспадарчага і метэаралагічнага вопыту народа. Песні каляндарных абрадаў паводле жанру: заклінальныя, велічальныя, жартоўныя, лірычныя, эпічныя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*41. Фальклорныя жанры ў кантэксце святочнай культуры: песні сямейных абрадаў*

Сямейныя абрады як складаны сакральна-магічны комплекс, у склад якога ўваходзяць песенныя, славесныя, гульнявыя і харэаграфічныя жанры. Жанравае багацце песень радзіннага і вясельнага абрадаў. Радзінныя і вясельныя песні паводле жанравай прыроды: заклінальныя, цырыманіяльна-рытуальныя, велічальныя, лірычныя, сатырычна-гумарыстычныя, прыпеўкі. Адлюстраванне абрадавых дзеянняў у тэкстах песень. Матывы, вобразы і паэтычныя сродкі. Паэзія пахавальнай абраднасці паводле жанравай прыроды: галашэнні, псалмы, духоўныя вершы. Імправізацыйная прырода галашэнняў. Увасабленне культу продкаў, сямейных і родавых каштоўнасцей. Народная мараль і этыка ў песенных творах гэтай групы.

*42. Фальклорныя жанры ў кантэксце святочнай культуры: пазаабрадавыя песні*

Песня ў народным свяце. Песня – універсальны лірычны жанр фальклору. Класіфікацыя пазаабрадавых песень. Жартоўныя песні: гуманізм і жыццесцвярджальны пафас. Мастацкія прыёмы стварэння камічнага: гратэск, кантраст, паўторы, пералічэнні, выклічнікі. Песні пра каханне: лірызм, ідэалізацыя вобразаў, паэтызацыя пачуцця. Асноўныя сюжэтныя матывы. Прыпеўкі: жартоўны характар, сувязь з музыкай і танцам. Нечаканасць камічнай развязкі як асноўны кампазіцыйны прыём. Балады як ліра-эпічны жанр: элементы цудоўнага, сямейна-бытавы ці маральна-этычны канфлікт, трагізм сюжэта. Купальскія балады. Народная мараль у пазаабрадавай песні.

*43. Славесныя і гульнявыя жанры ў кантэксце святочнай культуры*

Славесныя жанры ў кантэксце святочнай культуры: замовы, павер'і і прыкметы, прыказкі і прымаўкі, прыгаворкі, тосты-зычанні і інш. Тэрміналагічнае размежаванне паняццяў гульні, забавы і ігрышча. Велікодныя гульні: качанне яек, у біткі, *Крумкач*. Масавыя гулянні на *Юр'я, Тройцу* і *Купалле*. Восеньскае ігрышча Ката пячы. Універсальныя каляндарныя гульні *Явар, Юрачка, Падушачка, Цяцерка*. Гульні ў кантэксце хрэсьбінаў і вяселля.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*44. Народны тэатр у кантэксце святочнай культуры*

Народны тэатр як адметная з’ява народнай культуры. Умоўнасць мастацка-выяўленчых кампанентаў, непасрэднасць кантакту з гледачамі. Сінкрэтызм. Травестацыя. Лялечны тэатр батлейка. Школьны тэатр. Інтэрмедыі. Народная драма. «Цар Максіміліян». Рэпертуар, галоўныя матывы і вобразы народнага тэатра. Калядны абрад «Цары» в. Семежава Капыльскага р-на Мінскай вобл.

*45. Абыходныя абрады ў святочнай культуры*

Міфасемантыка абрадавых абыходаў: выкананне групай удзельнікаўзаклінальных і велічальных тэкстаў, узнагарода/адорванне. Каляндарныя абыходы: калядаванне/шчадраванне, валачобніцтва, ваджэнне куста, кліканне на Купалле і інш. Песні і вербальныя формулы абрадавых абыходаў.

*46. Правадныя абрады ў святочнай культуры*

Міфасемантыка правадных абрадаў: рытуалізаваная форма заканчэння абраду, святочнага цыкла, каляндарнага перыяду ці жыццёвага этапу. Элементы правадной абраднасці ў кантэксце календара: абрад «Цягнуць Каляду на дуба» Бярэзінскага р-на Мінскай вобл. Провады Масленіцы. Правадны/Фамін тыдзень. Абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы» Веткаўскага р-на Гомельскай вобл. Абрад «Провады русалкі» Хойніцкага р-на Гомельскай вобл. Рытуальныя провады ў вяселлі. Пахаванне як комплекс правадных рытуалаў.

*47. Прыгатаванне і ўжыванне абрадавай ежы*

Абрадавая ежа – складовая частка сямейных, каляндарных, гаспадарчых і аказіянальных абрадаў, прыгатаванне і ўжыванне якой рэгламентуецца сацыяльнымі нормамі і традыцыйнымі звычаямі. Сакральны характар абрадавай ежы: *куцця, пасха, яйкі, каравай, бабіна каша*. Рытуалізацыя прыгатавання абрадавай ежы: каравайны абрад. Рытуалізацыя спажывання абрадавай ежы: вызначальная роля гаспадара хаты і гаспадыні, мыццё рук, малітва, славесныя формулы, пакіданне абрадавай ежы на стале, скармліванне жывёле, захоўванне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*48. Пераапрананне і маскіраванне ў святочнай культуры*

Пераапрананне і маскіраванне – складовая частка сямейных і каляндарных абрадаў. Міфалагічная семантыка маскі як сувязь чалавека з іншасветам у рытуальных засцерагальных і прадуцыравальных дзеяннях. Сувязь персанажаў-масак з татэмізмам, фетышызмам і культам продкаў. Калядныя (шчадроўскія) персанажы-маскі: каза, мядзведзь, журавель, кабыла, дзед, шчодра, цыган, смерць. Калядны абрад «Цары» в. Семежава Капыльскага р-на Мінскай вобл. Элементы пераапранання і маскіравання ў радзінна-хрэсьбінным і вясельным абрадзе.

*49. Сямейныя і каляндарныя святы ў Спісе аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны: Мінская вобласць*

Адметнасць абрадаў і абрадавых практык Міншчыны: калядны абрад «Цары» в. Семежава Капыльскага р-на; абрад «Цягнуць Каляду на дуба» в. Новіны Бярэзінскага р-на; абрад «Пеpанос Міхайлаўскай свячы» а/г Вяляцічы Барысаўскага р-на.

*50. Сямейныя і каляндарныя святы ў Спісе аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны: Брэсцкая вобласць*

Семантыка абрадаў і абрадавых практык Брэстчыны: вясельная каравайная традыцыя в. Моталь Іванаўскага р-на; абрад «Намскі Вялікдзень» в. Аброва Івацэвіцкага р-на; вясновы абрадавы карагод «Стрылка» в. Бездзеж Драгічынскага р-на; абрад ваджэння Куста на другі дзень Тройцы а/г Лобча Лунінецкага р-на.

*51. Сямейныя і каляндарныя святы ў Спісе аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны: Віцебская вобласць*

Самабытнасць абрадаў і абрадавых практык Віцебшчыны: абрад «Жаніцьба Цярэшкі» Лепельскага р-на; Масленічная абрадавая гульня «Пахаванне Дзеда» Гарадоцкага р-на; абрад «Насіць намётку» в. Папшычы Глыбоцкага р-на.

*52. Сямейныя і каляндарныя святы ў Спісе аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны: Гомельская вобласць*

Унікальнасць абрадаў і абрадавых практык Гомельшчыны: абрад «Юр'я» (абрад «Тураўскі карагод» на свята Юр'я) в. Пагост Жыткавіцкага р-на; абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на; абрад «Провады русалкі» в. Вялікі Бор Хойніцкага р-на; абрад гукання вясны «Чырачка» а/г Тонеж Лельчыцкага р-на.

*53. Вялікдзень у Беларусі.*
*Хрысціянскія і свецкія напластаванні*

Генезіс і паходжанне назвы славянскага свята ў гонар Сонца, абуджэння прыроды і надыходу «вялікіх дзён» пачатку палявых работ. Тэрміны святкавання. Звычаі і традыцыі велікоднага святкавання ў дахрысціянскія часы. Абрадавая ежа. Сімволіка яйка, адметнасць яек-крашанак і яек-пісанак. Этымалогія слова «валачобнікі». Валачобны абрад як спецыфіка беларускай велікоднай абраднасці. Знікненне абраду ўСярэдневякоўі пад уплывам хрысціянскай царквы. Хрысціянскія напластаванні на сэнс і змест велікоднай абраднасці. Адметнасці беларускіх хрысціянскіх традыцый адзначэння свята Уваскрэсення распятага Хрыста.

*54. Традыцыйнае і сучаснаеў свяце Дажынкі*

Старажытны земляробчы абрад. Свята заканчэння ўборкі ўраджаю. Свята талакі – родзічаў, сяброў, суседзяў. Суправаджэнне дзеі спецыяльнымі абрадавымі песнямі. Дажынкі – як фестываль-кірмаш працаўнікоў сучаснай вёскі. Вандроўнае свята ад гарадка да мястэчка. Свята правінцыяльнага асяроддзя, якое на пэўны час робіцца сталіцай краіны. Ушанаванне і ўзнагароджанне земляробаў-спецыялістаў па зборы ўраджаю (камбайнераў). Свята народнай музыкі і песні. Сучаснае эстраднае шоу ў гонар пераможцаў сельскагаспадарчага спаборніцтва.

*55. Паратэатральная культура*
*беларускага горада XVII–XVIIIстст.*

Сацыяльна-культурная характарыстыка беларускіх гарадоў XVII–XVIIIстст. Этнаканфесіянальная структура беларускіх гарадоў. Характарыстыка гарадскіх свят полісацыяльнага і субсацыяльнага тыпаў. Наданне Магдэбургскага права і стварэнне федэратыўнай дзяржавы Рэчы Паспалітай як фактары, стымулюючыя распаўсюджванне заходнееўрапейскіх культурных традыцый у гарадахВКЛ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*56. Афіцыйныя святочныя цырымоніі беларускага горада XVII–XVIIIстст.*

Развіццё новай мадэлі ў святочнай абраднасці беларускага горада. Віды афіцыйных святочных цырымоній. Падрыхтоўчы перыяд і стварэнне сцэнарыяў цырымоній. Кампазіцыйная структура афіцыйнай цырымоніі і строгая рэгламентацыя паводзін удзельнікаў. Выразныя сродкі сустрэчнага цырыманіялу і ўрачыстага шэсця. Поліканфесіянальны характар афіцыйных святочных цырымоній беларускага горада. Эпізоды забаўляльнага характару. Фінальныя эпізоды цырымоній.

*57. Тэатралізаваныя паляванні беларускай шляхты як формы паратэатральнай культуры*

Тэатралізаванае паляванне і яго функцыі ў сістэме шляхецкай культуры. Паляванні часоў вялікага князя Вітаўта, Стэфана Баторыя, Аўгуста ІІІ. Кампазіцыйная структура каралеўскіх паляванняў. Штрэка – маляўнічы эпізод каралеўскага палявання, які захаваўся да нашых дзён. Прыватныя ловы магнатаў. Паляўнічая субкультура, створаная шматвяковай традыцыяй палявання.

*58. Выразныя сродкі сямейна-бытавых урачыстасцей беларускай шляхты*

Комплекс вясельнай абраднасці магнатаў і шляхты. Святочныя ўрачыстасці з нагоды дня нараджэння магната і членаў іх сямей. Нормы заключэння шлюбу і іх уплыў на характар святкавання. Структура і выразныя сродкі пахавальнага рытуалу «Pompafunebris».

*59. Асаблівасці рэжысуры народнага абраду на вольным паветры*

Фарміраванне абрадавых гуртоў згодна ўзроставай дыферэнцыяцыі, падзел зон дзеяння кожнага абрадавага калектыву (Каляды, Вялікдзень), падрыхтоўка абрадавых касцюмаў, масак і лялек, рэквізіту, бутафорыі.

Шэсце ўдзельнікаў абраду па вёсцы як спосаб актывізацыі гледачоў, тэатралізаваная форма стварэння перадсвяточнай атмасферы. Мастацка-дэкаратыўнае афармленне месца дзеяння і вызначэнне цэнтральнага мізансцэнічнага пункта абраду. Традыцыйнае прасторавае вырашэнне абраду з абавязковым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падзелам тэрыторыі дзеяння на дзве зоны: вёска (хата, падворак, вуліца) і вясковае наваколле (поле, луг, лес, рэчка).

*60. Святочны каляндар сучаснай Беларусі*

Свята як спосаб адлюстравання падзеі ў жыцці грамадства, калектыву, асобы. Масавае свята як комплекс палітычных, мастацкіх, спартыўных, абрадава-рытуальных і масава-гульнявых форм. Адлюстраванне ў святах гістарычных, эканамічных, матэрыяльных і маральных каштоўнасцей соцыуму, народа. Асноўныя тыпы свят і іх характэрныя асаблівасці: дзяржаўныя, грамадска-палітычныя, міжнародныя, прафесійныя, рэлігійныя, маладзёжныя і дзіцячыя святы. Беларускія народныя святы каляндарнага цыкла, сямейна-бытавыя святы і абрады.

## Раздзел III. Тэхналогія стварэння свята

*61. Палажэнне аб правядзенні свята – вызначальны і формаўтваральны пачатак мастацкай і арганізацыйна-вытворчай дзейнасці па стварэнні святочных мерапрыемстваў*

Палажэнне аб правядзенні свята як комплексная праграма яго творчага, матэрыяльна-тэхнічнага, арганізацыйнага і фінансавага забеспячэння, дакумент па рэалізацыі розных пытанняў увасаблення святочнага дзеяння. Задачы асноўных кірункаў палажэння. Вырашэнне арганізацыйных пытанняў свята заказчыкамі – адпаведных дзяржаўных органаў, устаноў на аснове палажэння.

*62. Склад аргкамітэта свята і функцыянальныя абавязкі яго ўдзельнікаў*

Аргкамітэт як часовае аб’яднанне, створанае па загадзе органаў дзяржаўнай улады ці іншай установы для вырашэння разнастайных пытанняў творчага, матэрыяльна-тэхнічнага, арганізацыйнага і фінансавага забеспячэння свята. Склад аргкамітэта і яго структурных падраздзяленняў. Рабочы план падрыхтоўкі свята.

*63. Рабочы план падрыхтоўкі свята*

Рабочы план падрыхтоўкі свята як каардынацыя працэсу выканання разнастайных відаў работ супрацоўнікамі структур-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных падраздзяленняў аргкамітэта. Юрыдычная аснова ўвасаблення святочных дзей. Работа ініцыятыўнай групы па папярэднім размеркаванні сярод арганізацый, прадпрыемстваў розных відаў работ, вызначэнне тэрмінаў і адказных за іх выкананне. Вытворчы аналіз сцэнарыяў разнастайных святочных дзей з пункту гледжання іх творчага, матэрыяльна-тэхнічнага, арганізацыйнага і фінансавага забеспячэння. Структура канчатковага варыянта рабочага плана падрыхтоўкі свята.

*64. Творчая заяўка на правядзенне свята як эксплікацыя першапачатковага бачання рэжысёрскай задумы свята*

Творчая заяўка – задума будучага праекта свята, прадстаўлення, адлюстраваная ў вольнай форме, мэтай якой з'яўляецца абдуманы спосаб аўтара зацікавіць работадаўцу, прадзюсара ў паспяховым выніку, сацыяльнай значнасці, актуальнасці будучага твора мастацтва.

*65. Формы стварэння перадсвяточнай і святочнай атмасферы*

Арганізацыя перадсвяточнай атмасферы як працэс далучэння ў падрыхтоўку свята прадстаўнікоў розных тыпалагічных груп насельніцтва. Формы стварэння перадсвяточнай атмасферы: мерапрыемствы інфармацыйнага, агульнаарганізацыйнага, вытворча-конкурснага характару. Формы стварэння святочнай атмасферы.

*66. Арганізацыйна-вытворчы аналіз сцэнарыя свята*

Этапы арганізацыйна-вытворчага аналізу сцэнарыя: творчае забеспячэнне; выпіска новых нумароў; выяўленне аб'ёму неабходных будаўнічых і мастацкіх работ для ўвасаблення мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята; дэталёвая распрацоўка поўнага складу пастановачнай групы; матэрыяльна-тэхнічнае і арганізацыйнае забеспячэнне новых нумароў, мастацка-дэкаратыўнага афармлення; разгляд шляхоў фінансавання свята, складанне праекта каштарыса.

*67. Работа куратараў і валанцёраў на свяце*

Вызначэнне задач куратараў, валанцёраў у перыяд падрыхтоўкі і правядзення святочнага мерапрыемства. Складанне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

плана работы куратараў і валанцёраў на свяце. Конкурсны адбор валанцёраў свята, інструктаж, навучанне і выпрацоўка неабходных навыкаў (веданне праграмы свята, геаграфіі задзейнічаных святочных локусаў, аб'ектаў жылля і харчавання ўдзельнікаў, веданне замежнай мовы (пры неабходнасці), этыкету і інш.). Арганізацыйныя і творчыя абавязкі куратараў свята. Правядзенне «штабных гульняў» і рэпетыцый з валанцёрамі свята.

*68. Галоўныя этапы творчага супрацоўніцтва рэжысёра-пастаноўшчыка і галоўнага мастака ў перыяд пастаноўкі*

Задума мастацкага афармлення свята, прадстаўленне. Стварэнне макета і эскізаў архітэктурна-дэкаратыўнага вырашэння, узораў плаката, афішы і рэкламнай прадукцыі. Зацвярджэнне мастацкага вырашэння на пасяджэнні аргкамітэта. Аўтарскі нагляд галоўнага мастака за вырабам мастацкага афармлення і рэкламнай прадукцыі. Мантаж мастацкага афармлення. Дэмантаж элементаў мастацкага афармлення пасля заканчэння свята.

*69. Арганізацыйныя аспекты мастацка-дэкаратыўнага афармлення свята*

Дакументацыя для стварэння мастацка-дэкаратыўнага афармлення свята. Комплексны план – аргументацыя, назва, тэма, мэта і задачы свята; час і месцаправядзення; каларыстычная карта, шрыфты, эмблема; касцюмы, кампазіцыйнае вырашэннепрасторыдзеяння. Эскізыпапяровыя і камп'ютарныя. Рэкламна-інфармацыйныматэрыял свята.

*70. Асаблівасці арганізацыі прасторы свята ў закрытым памяшканні сродкамі сцэнаграфіі*

Веданне і прафесійнае выкарыстанне сцэнічных магчымасцей і даступных тэхналогій сцэнічных пляцовак. Завязка, кульмінацыя, развязка як неабходныя элементы сцэнічнай і мастацкай пабудовы. Жанравасць. Дынамічнасць. Сцэнічная ўмоўнасць. Мізансцэны. Сцэна-каробка і чалавек-модуль. Лінейная і паветраная перспектывы, прапорцыі. Фактура дэкарацыі. Прамяні бачнасці сцэнічнай прасторы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*71. Сучасныя віды рэкламы святочных дзей*

Віды рэкламы: вонкавая, транзітная, друкаваная (СМІ), паштовая, тэатралізаваная, тэле-, радыё-, інтэрнэт-рэклама, рэкламныя вырабы. Тэрміны распрацоўкі, вырабу і размяшчэння рэкламы.

*72. Спецыфіка падрыхтоўкі і арганізацыі рэпетыцыйнай работы ў святах фестывальнага тыпу*

Асаблівасць падрыхтоўкі свят фестывальнага тыпу. Планаванне рэпетыцыйнай работы з куратарамі свята, іх роля ў пабудове і чысціні выканання цырыманіяльных дзей.

Характар работы з валанцёрамі свята. Правядзенне музычных і тэхнічных рэпетыцый. Планаванне і падрыхтоўка рэжысёрскіх «эскізаў» фестывальных урачыстасцей.

*73. Рэжысёр як крэатыўны і асацыіраваны прадзюсар мастацкага відовішча*

Паняцце «прадзюсар» і яго функцыі ў арганізацыі і стварэнні святочных дзей. Функцыі рэжысёра як крэатыўнага і асацыіраванага прадзюсара. Распрацоўка праекта дамовы па раздзелах: абавязкі, адказнасць, узаемаразлікі бакоў падчас падрыхтоўкі свята. Складанне папярэдняга каштарыса святочнага мерапрыемства па прадстаўленым сцэнарным плане. Складанне творчай часткі канчатковага каштарыса і кантроль дагавораўпадраду.

*74. Прэс-рэліз – важны арганізуючы элемент падрыхтоўкі свят фестывальнага тыпу*

Палажэнне аб правядзенні фестывалю і прэс-рэліз, іх функцыі. Структура прэс-рэліза. Тэхнічны райдэр калектыву. Пострэліз і яго месца ў інфармацыйнай прасторы фестывальных урачыстасцей.

*75. Арганізацыя святочнага феерверку, піратэхнічнай дзеі свята*

Піратэхнічная дзея як выразны сродак свята. Тэхналогія арганізацыі феерверку. Пагадненне аб правядзенні дзеі. Спосабы дастаўкі і захавання піратэхнічных вырабаў. Асаблівасці падрыхтоўкі фанаграмы піратэхнічнага прадстаўлення. Задачы работы ДАІ, міліцыі, пажарнай і медыцынскай службаў у час падрыхтоўкі і правядзення феерверку.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*76. Новыя аўдыявізуальныя тэхналогіі*
*ў рэжысуры сучасных мастацкіх відовішчаў*

Гуказапіс (аналагавы і лічбавы). Звядзенне гуку. Майстарынг. Фарматы фанаграм і іх магчымасці. Камп'ютарная графіка і анімацыя. Інтэрактыўныя і сеткавыя рэпетыцыі. Праекцыя і тэлебачанне. Спецэфекты і піратэхніка.

*77. Фінансавая дзейнасць у свяце.*
*Папярэдні і канчатковы каштарысы свята*

Тэхналогія стварэння папярэдняга каштарыса па схеме: арэнда, аплата паслуг па тэхнічным забеспячэнні; аплата паслуг рэжысёрска-пастановачнай групы, артыстаў, творчых спецыялістаў і калектываў, адміністрацыйна-гаспадарчага і тэхнічнага персаналу. Аплата паслуг мастацка-дэкарацыйнага афармлення тэрыторый, памяшканняў, сцэнічных пляцовак. Набыццё, выраб, арэнда касцюмаў, прадметаў рэквізіту, бутафорыі. Распрацоўка, выраб і размяшчэнне рэкламных, інфармацыйных і прэзентацыйных матэрыялаў. Аплата транспартных паслуг. Выплата ўзнагарод за карыстанне аб'ектам аўтарскіх і сумежных правоў у адпаведнасці з заканадаўствам. Забеспячэнне бяспекі, уборка тэрыторый, памяшканняў. Аплата паслуг медыцынскай дапамогі і брыгады МНС.

*78. Стварэнне прызавога фонду свята*

Задачы стварэння прызавога фонду. Складанне пераліку прызоў у адпаведнасці з тэматычнай, узроставай накіраванасцю масава-гульнявой дзеі і яе складанасцю. Напрамкі фінансавання прызавога фонду свята. Захаванне прызоў у дасвяточны і святочны перыяды. Падзел адзінак прызавога фонду па асобных гульнявых зонах і працэдура перадачы іх культарганізатарам. Складанне акта выкарыстання прызоў пасля завяршэння свята.

*79. Арганізацыя святочнага кірмашу*

Кірмаш як састаўная частка свята і яго задачы. Утварэнне і склад кірмашовай дырэкцыі, яе функцыянальныя абавязкі. Арганізацыя нацыянальных гандлёва-культурных зон. Праверка харчовых прадуктаў у адпаведнасці з вызначанымі правіламі ветэрынарна-санітарнай экспертызы. Гандлёва-гульнявыя дзеянні як адметная асаблівасць беларускага кірмашу. Куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

турная праграма кірмашу і яе падзел на відовішчную і масава-гульнявую часткі. Наладжванне работы гульнявога поля з комплексам народных забаў і атракцыёнаў.

### *80. Арганізацыя прыёму гасцей свята. Культурная праграма для розных груп гасцей свята*

Работа аргкамітэта па запрашэнні на свята дэлегацый гасцей і творчых калектываў з іншых раёнаў, гарадоў, дзяржаў. Стварэнне куратарскай групы. Асаблівасці тэхналогіі размяшчэння гасцей. Пытанні харчавання ўдзельнікаў свята. Праблема аднаўлення культурна-бытавых традыцый беларусаў, стварэння спецыфічнага комплексу страў кожнага канкрэтнага свята. Арганізацыя конкурсу прафесіянальных кухараў на свяце. Вызначэнне месца, меню, графіка харчавання гасцей і творчых калектываў свята. Распрацоўка культурнай праграмы з улікам прафесіянальнага, сацыяльнага і ўзроставага складу дэлегацый гасцей. Пазнавальна-інфармацыйны, адпачынкавы, бытавы кірункі культурнай праграмы.

### *81. Арганізацыя работы дапаможных службаў на свяце*

Дапаможныя службы свята, іх структура і функцыянальныя абавязкі работнікаў. Пажарная служба свята. Медыцынская служба свята. Служба бяспекі дарожнага руху і дзяржаўнай аўтаінспекцыі на свяце. Служба аховы парадку.

### *82. Распрацоўка службовай дакументацыі (рэжысёрскія выпіскі, ліставанне, графікі работы дапаможных службаў, руху транспарту і інш.)*

Работа пастановачнай групы па распрацоўцы службова-арганізацыйнай дакументацыі па правядзенні свята. Тэхнічны аналіз галоўным рэжысёрам, мастаком і дырэктарам свята літаратурнага сцэнарыя. Складанне выпісак і партытур усіх відаў тэхнічнага і тэхнічна-арганізацыйнага дзеяння, праца з членамі тэхнічна-пастановачнай групы.

Распрацоўка схем службова-творчай арганізацыйнай дакументацыі: партытура музыкі і шумоў; партытура святла; выпіска на касцюмы, абутак і галаўныя ўборы; выпіска на парыкі, грым і наклейкі; выпіска на рэквізіт, бутафорыю і мэблю свята; пералік адзінак прызавога фонду; графік работы аўтатранспар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ту свята; графік рэпетыцыйнага працэсу; графік пасяджэнняў аргкамітэта; партытура тэхнічных перастановак.

### *83. Канчатковыя фінансавыя разлікі з удзельнікамі свята. Дагавор падраду. Актпрыёму выкананых работ*

Віды канчатковага фінансавання выканаўцаў і арганізатараў свята. Дагавор падраду. Акт прыёму выкананых работ. Аплата членаў пастановачнай групы. Характар падаткаабкладання аўтарскіх ганарараў. Акт спісання рэквізіту свята.

### *84. Тэхналогія стварэння сучаснага флэшмоба*

Флэшмоб – як творчы спосаб прыцягнення ўвагі грамадскасці да якой-небудзь значнай праблемы. Напісанне сцэнарыя. Падбор неабходныхаксесуараў. Пошук творчых і свядомых аднадумцаў альбо калектыву пад кіраўніцтвам уплывовай асобытворцы. Максімальная сінхранізацыя дзеянняў і роляў удзельнікаў. Падбор пэўнага месца для правядзення.

### *85. Нарматывы правядзення святочных мерапрыемстваў у Рэспубліцы Беларусь*

Правядзенне масавых мерапрыемстваўу любых прыдатных для гэтай мэты месцах, за выключэннем месцаў, вызначаных у артыкуле 9 «Месца і час правядзення масавага мерапрыемства» Закона Рэспублікі Беларусь «Пра масавыя мерапрыемствы ў Рэспубліцы Беларусь».

### *86. Тэхналогія завочнага стварэння сумесных масавых фрагментаў свята*

Стварэнне і пастаяннае аднаўленне камп’ютарнай базы даных творчых калектываў і выканаўцаў, іх рэпертуару і перспектыўных магчымасцей, тэхнічных арганізацый, маючых дачыненне да работы з масавымі відовішчамі. Выкарыстанне тэлефонных канферэнцый, інтэрнэт-тэхналогій падчас арганізацыйнага працэсу для правядзення завочных рэпетыцый, перамоў.

### *87. Маскі і карнавалізацыя як элемент арганізацыі сучаснага свята*

Месца і роля масак і карнавалізацыі як аднаго са сродкаў рэкламы, актывізацыі ўдзельнікаў у стварэнні перадсвяточнай атмасферы сучаснага свята. Традыцыйная маска ў структуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сучасных беларускіх народных свят каляндарнага цыкла, сямейных урачыстасцей. Карнавалізацыя як старадаўняя форма арганізацыі асобных святочных дзей, касцюміраванай урачыстай працэсіі, маніфестацыі. Творчая арганізацыя карнавалізацыі сучаснага шэсця. Арганізацыйна-вытворчыя пытанні – размеркаванне ўвасаблення эпізодаў карнавалізаванай дзеі паміж арганізацыямі, установамі, прадпрыемствамі, асобнымі ўдзельнікамі. Карнавалізаваныя шэсці і дзеі падчас правядзення святгорада, народнага календара, сярэдневяковай культуры, Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і інш.

### *88. Канцэптуальныя падыходы да арганізацыі фестываляў вулічных тэатраў*

Асаблівасць вулічных спектакляў – адсутнасць падзелу на артыстаў і гледачоў. Інтэрактыўны характар прадстаўленняў – уключэнне гледача ў тэатралізаваную дзею. Жанравая характарыстыка вулічных спектакляў (флэшмоб, хэпінінг, фаер-шоу, перформанс і інш.). Выразныя сродкі прадстаўленняў – відовішчнасць, эмацыянальнае ўздзеянне на гледача, клаўнада і інш. Поліфанічнасць работы тэатральных пляцовак. Выкарыстанне сучасных тэхнічных тэхналогій падчас паказу прадстаўленняў.

### *89. Традыцыйнае і сучаснае ў стварэнні відэакантэнта святочнай дзеі*

Кінахроніка. Тэатр ценяў. Жывыя скульптуры. Масавыя сцэны. Раўс. Футаж. Відэаінсталяцыя. Відэамэпінг. Злучэнне 3D-экранаў і жывых выканаўцаў у адзіным дзеянні. Сінхранізацыя гуку і відэа як галоўны спосаб асаблівага эмацыянальнага ўздзення на аўдыторыю гледачоў і ўдзельнікаў святочнай дзеі.

### *90.Фандрайзінг, напрамкі фінансавання фонду свята*

Праектны, аператыўны, унутраны і знешні фандрайзінг. Метады прыцягнення рэсурсаў у фандрайзінгу. Паняцці «мецэнат», «фундатар», «донар».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СПІС ЛІТАРАТУРЫ


*Асноўная*

*Арутюнов, С.А*. Обычай, ритуал, традиция / С.А.Арутюнов // Сов. этнография. – 1981. – № 2.

*Базанов, В.В.* Техника и технология сцены / В.В.Базанов.– Л.: Искусство, 1976. – 234 с.

*Байбурин, А.К.*Ритуал в традиционной культуре. Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов / А. К. Байбурин; отв. ред. Б. Н. Путилов ; РАН. МАЭ им. Петра Великого (Кунсткамера). – СПб.: Наука, 1993. – 239с.

*Барышев, Г.И.*Театральная культура Белоруссии XVIII века / Г. И. Барышев.– Минск :Беларус.навука, 1992. – 234с.:ил.

Беларускія народныя абрады / склад., навук. рэд. і прадм. Л. П. Касцюкавец. – Мінск: Беларусь, 1994. – 128 с.

Беларусы. Т.6. Грамадскія традыцыі / В.Ф.Бацяеў [і інш.]; рэдкал. : В.М.Бялявіна [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – 606 с.: іл.

*Богданович, А.* Пережитки древнего миросозерцания у белорусов / А.Богданович. – Минск: Беларусь, 1995. – 186 с.

Восточнославянский фольклор: словарь науч. и нар. терминологии / редкол.: К.П.Кабашников [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1993. – 487 с.

*Гуд, П.А.*Беларускае Купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей / П.А.Гуд. – Мінск:БДУ культуры, 1999. – 137 с.

*Гуд, П.А.* Беларускі кірмаш / П.А. Гуд, Н.І. Гуд. – Мінск: Полымя, 1996. – 270 с.: іл.

*Гуд, П.А.* Мастацтва феерверкаў / П.А.Гуд. – Мінск: Мэджик Бук, 2007. – 100 с.: іл.

*Гуд, П.А.* Тэхналогія стварэння свята / П.А.Гуд. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 234 с.

Гульні, забавы, ігрышчы / рэдкал.: А.С.Фядосік [і інш.]. – Мінск: Беларус.навука, 1996. – 534 с.

*Гусев, В.Е.* Народные игры, драмы и театр / В.Е.Гусев // Этнография восточных славян. Очерки традиционной культуры. – М.: Наука, 1987. – 458 с.

*Гуревич, А.Я.* Проблемы средневековой народной культуры / А.Я.Гуревич. – М.: Искусство, 1981. – 359 с.: ил.

*Гурскі, А.І.* Святкаванне Каляд на Беларусі / А.І.Гурскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 94 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Джексон, Ш*. Пособие по изготовлению театрального костюма / Ш.Джексон. – М.: Искусство, 1984. – 144 с.

*Емельянов, Е.Д.* Звукофикация театров и концертных залов / Е.Д.Емельянов. – М.: Искусство, 1989. – 272 с.

Жаніцьба Цярэшкі / уклад. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Л. М. Салавей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 518 с.

*Захаржевская, Р.* Костюм для сцены / Р. Захаржевская. – М. : Сов. Россия, 1967. – 176 с.

Земляробчы каляндар. Абрады і звычаі / уклад., класіфікацыя, сістэматызацыя матэрыялаў і камент. А.І.Гурскага; уступ. арт. А.І.Гурскага, А.С.Ліса. – 2-е выд., выпр. – Мінск: Беларус. навука, 2003. – 429 с.

*Камінскі, А.Я.* Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства / А.Я.Камінскі. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2011. – 112 с.

*Камінскі, А.Я.* Зімовыя святы / А.Я.Камінскі. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2009. – 140 с.

*Камінскі, А.Я.* Рэжысура традыцыйнага абраду / А.Я.Камінскі. – Мінск: БДУ культуры і мастацтваў, 2009. – 113 с.

*Калачова, І. І.* Народныя традыцыі і звычаі выхавання: этнапедагагічная спадчына этнасаў Беларусі / І.І.Калачова. – Мінск: Беларусь, 1999. – 179 с.

*Карскі, Я*. Беларусы / Я.Карскі; уклад. і камент. С.Гараніна і Л.Ляўшун; навук. рэд. А.Мальдзіс. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2001. – 640 с.

*Катовіч, А.* Веснавыя святы: нарысы: у 2 кн. / А.Катовіч, Я. Крук. – Мінск: Мастац. літ., 2005. – Кн. 1. – 359 с.

*Катовіч, А.* Зімовыя святы: нарысы / А.Катовіч, Я.Крук. – Мінск: Мастац. літ., 2004. – 119 с.

*Котлярчук, А. С.* Праздничная культура в городах России и Белоруссии XVII века: официальные церемонии и крестьянская обрядность / А.С.Котлярчук. – СПб.: Петерб.востоковедение, 2001. – 238 с.

*Крук, І.І.* Сімволіка беларускай народнай культуры / І. І. Крук. – Мінск: Беларусь, 2003. – 350 с.: іл.

*Кухаронак, Т.І.* Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск: Ураджай, 2001. – 239 с.

*Кухаронак, Т.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX–XX ст. / Т.Кухаронак. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 126 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Ліс, А.С.* Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў: сістэма жанраў. Эстэтычны аспект / А.С.Ліс. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 188 с.

*Лозка, А.* Беларуская батлейка. Каляндарныя і абрадавыя гульні / А.Лозка. – Мінск: Тэхналогія, 1997. – 183 с.

*Мальдзіс, А.* Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII ст.: Нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мінск: Беларус. навука, 1982. – 276 с.

*Мальдзіс, А.* Як жылі нашыя продкі ў XVIII ст. / А. Мальдзіс. – Мінск: Ураджай, 2001. – 178 с.

*Митта, А.* Кино между адом и раем / А.Митта. – М.: Подкова, 2002. – 480 с.

*Мочалов, Ю.* Композиция сценического пространства: поэтика мизансцены / Ю.Мочалов. – М.: Просвещение,1981. – 239 с.

Народная культура Беларусі: энцыкл. даведнік. – Мінск: Беларус.навука, 2002. – 432 с.: іл.

Народны тэатр / уклад. М.А.Каладзінскі. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 554 с.

*Пави, П.* Словарь театра / П.Пави. – М.: Прогресс, 1991. – 504 с.:ил.

*Петров, Б.Н.* Массовые спортивно-художественные представления: основы режиссуры, технологии, организации и методики / Б.Н.Петров. – М.: ТВТ Дивизион, 2006. – 374 с.: ил.

Радзіны. Абрад. Песні / рэдкал.: А.С.Фядосік [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 637 с.:іл.

*Ремез, О.* Мизансцена – язык режиссера / О.Ремез. – М.: Просвещение, 1965. – 123 с.

*Романов, Е.Р.* Белорусский сборник: быт белоруса / Е. Р. Романов. – Вильно, 1912. – Вып.8.

Сям'я і сямейны быт беларусаў / рэдкал.: В.М.Бялявіна [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 2002. – 345 с.

*Тавлай, Г.В.* Белорусское купалье: обряд, песня / Г. В. Тавлай. – Минск: Наука и техника, 1986. – 174 с.:ил.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева [і інш.]; склад. Т.Б.Варфаламеева. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне. – 910 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / В. І. Басько [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 2006. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. – 608 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Т. 1: Магілёўскае Падняпроўе.– 790 с.

*Фонштейн, В.* Куклы театрализованного представления / В. Фонштейн // Художник и зрелище: сб. ст. – М.:Сов. художник, 1990. – 542 с.

*Фядотаў, А.Г.* Элементы народнай культуры беларускай шляхты ў сучасных гарадскіх святах / А.Г.Фядотаў // Музычнае і тэатральнае мастацтва: праблемы выкладання: навук.-метад. часопіс. – 2008. – № 2. – С. 48–51 : іл.

*Черняк, Ю.М.* Режиссура праздников и зрелищ / Ю. М. Черняк. – Минск: ТетраСистемс, 2004. – 221 с.

*Чечетин, А.И.* Искусство театрализованных представлений / А. И. Чечетин. – М.: Сов. Россия, 1988. – 136 с.

*Шарая, О.Н.* Ценностно-нормативная природа почитания предков / О.Н.Шарая. – Минск:Технология, 2002. – 249 с.

*Шароев,* И.Г. Режиссура эстрады и массовых представлений / И. Г. Шароев. – М.: Просвещение, 1986. – 463 с.

*Шейн, П.В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях / П.В.Шейн. – СПб.:Тип. Имп. акад. наук, 1877. – Т.1. – 585 с.

*Шейн, П.В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В.Шейн // Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях / П.В.Шейн. – СПб.:Тип. Имп. акад. наук,1902. – Т.3 – 535 с.

*Дадатковая*

*Базанов, В.В.* Сцена XX века / В.В.Базанов. – Л.:Искусство, 1990. – 239 с.

*Барташэвіч, Г.А.* Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя / Г.А.Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 184 с.

*Бахтин, М.М.* Франсуа Рабле н народная культура Средневековья и Ренессанса / М.М.Бахтин. – М.: Худож. лит., 1965. – 527 с.

Валачобныя песні / склад.: Г.А.Барташэвіч, Л.М.Салавей; рэд.тома К.П.Кабашнікаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 560 с.

Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі. – Мінск: Навука і тэхніка,1990. – 248с.:іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі. – Мінск:Навука і тэхніка,1993. – 256с.:іл.

*Гурскі, А.І.* Чаму вучыць народная песня / А.І.Гурскі. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 192 с.

*Жигульский, К.* Праздник и культура / К.Жигульский. – М.: Прогресс, 1985. – 336 с.

*Казакова, І.В.* Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў / І.В.Казакова. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 150 с.

*Киркор, А.К.* Белорусское Полесье. Следы язычества в праздниках, обрядах и песнях / А.К.Киркор // Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье: репринт. воспроизведение изд. 1882 г. – 2-е изд. – Минск: БелЭн, 1994. – 550 с.: ил.

*Крук, Я.* Колесо времени: традиции и современность / Я. Крук, О. Котович. – Мінск:Ураджай,2004.– 241с.

*Крук, Я.* Следам за сонцам: Беларускі народны каляндар / Я. Крук. – Мінск: Беларусь, 1998. – 216 с.

*Ліс, А.С.* Купальскія песні / А.С.Ліс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 208 с.

Рэлігія і царква на Беларусі: энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г. П.Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2001. – 368 с.

*Сысоў, У.М.* З крыніц спрадвечных / У.М.Сысоў. – Мінск: Выш. шк., 1997. – 415 с.

*Фядотаў, А.Г.* Канфесіянальныя цырымоніі і святы беларускага горада XVII–XVIII стагоддзяў / А.Г. Фядотаў // Вестн. мол. науч. об-ва. – Минск: Мол. науч. об-во, 2003. – 106 с.

*Черняк, Ю.М.* Театрализованное представление в массовом празднике-юбилее города / Ю.М.Черняк. – Минск: Минский ин-т культуры, 1989. – 17 с.

*Шейбак, В.В.* Христианские традиции паломничества у белорусов в конце XIX – начале XX в. / В.В.Шейбак // Пытанні мастацтва, этналогіі і фалькларыстыкі: у 2 ч. Ч.1. Мастацтва, фальклор і этналогія / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы Нац. акад. навук Беларусі; навук. рэд. А.І.Лакотка. – Мінск: Беларус. навука, 2006. – 515 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

**10 балаў** (надзвычай выдатна) – заслугоўвае студэнт, які паказаў усебаковыя сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы дзяржаўнага экзамену, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы; беспамылкова адказаў на ўсе пытанні. Свабодна аперыруе навуковай прафесійнай тэрміналогіяй (у тым ліку на замежнай мове); бездакорна валодае інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, умее яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы, вырашэнні навуковых і прафесійных задач; выяўляе здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі; поўна і глыбока засвоіў асноўную і дадатковую літаратуру; умее свабодна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вучэбнайдысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку; выказвае свае меркаванні, паказвае жаданне, здольнасць і імкненне да самастойнага папаўнення гэтых ведаў.

**9 балаў** (выдатна) – заслугоўвае студэнт, які паказаў усебаковыя сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы дзяржаўнага экзамену; дакладна выкарыстоўвае навуковую тэрміналогію (у тым ліку на замежнай мове); валодае інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, умее яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы, вырашэнні навуковых і прафесійных задач; выяўляе здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў рамках вучэбнай дысцыпліны; поўна засвоіў асноўную і дадатковую літаратуру; умее арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку.

**8 балаў** (амаль выдатна) – заслугоўвае студэнт, які паказаўсістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы дзяржаўнага экзамену; выкарыстоўвае навуковую тэрміналогію (у тым ліку на замежнай мове); валодае інструментарыем вучэбнай дысцыпліны (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), умее яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач; самастойна вырашае складаныя праблемы ў рамках вучэбнай дысцыпліны; засвоіў асноўную і дадатковую літаратуру; умее



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку.

**7 балаў** (вельмі добра) – заслугоўвае студэнт, які паказаў сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах дзяржаўнага экзамену; выкарыстоўвае навуковую тэрміналогію (у тым ліку на замежнай мове); умее рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валодае інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, умее яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач; свабодна валодае тыпавымі рашэннямі ў рамках праграмы дзяржаўнага экзамену; засвоіў асноўную і дадатковую літаратуру; умее арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку.

**6 балаў** (добра) – заслугоўвае студэнт, які паказаў дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы па дзяржаўным экзамене; выкарыстоўвае неабходную навуковую тэрміналогію, умее рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы; валодае інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, умее яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач; самастойна прымяняе тыпавыя рашэнні ў рамках вучэбнай праграмы; засвоіў асноўную літаратуру; умее арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку.

**5 балаў** (амаль добра) – заслугоўвае студэнт, які паказаў дастатковае веданне асноўнага вучэбнага матэрыялу; выкарыстоўвае навуковую тэрміналогію, правільна адказвае на пытанні; умее выкарыстоўваць інструментарый вучэбнай дысцыпліны ў вырашэнні вучэбных і прафесійных задач; здольны самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў рамках вучэбнай праграмы; засвоіў асноўную літаратуру.

**4 балы** (дастаткова здавальняюча) – у студэнта дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі; напалову засвоіў асноўную літаратуру, рэкамендаваную вучэбнай праграмай; у некаторых выпадках выкарыстоўвае навуковую тэрміналогію, лагічна адказвае на пытанні, умее рабіць высновы без істотных памылак; валодае інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, умее яго выкарыстоўваць у вырашэнні стандартных (тыпавых) задач; у большасці выпадкаў арыентуецца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках вучэбнай дысцыпліны і дае ім ацэнку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**3 балы** (нездавальняюча) – недастаткова поўны аб’ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі; веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай па вучэбнай дысцыпліне; адказ на пытанні адбываецца з істотнымі памылкамі; недастатковае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць у вырашэнні стандартных (тыпавых) задач; няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках дадзенай вучэбнай дысцыпліны.

**2 балы** (нездавальняюча) – фрагментарныя веды ў межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі; веданне асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных па вучэбнай дысцыпліне; няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубых памылак.

**1 бал** (нездавальняюча) – адсутнасць ведаў і кампетэнцый у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, адмова ад адказу, няяўка на атэстацыю без уважлівай прычыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# РЭЖЫСУРА СВЯТ

*Праграма дзяржаўнага экзамену*
*па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01*
*Рэжысура свят (народныя)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2016. Фармат $60x84^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 2,21. Ул.-выд. арк. 1,65. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ